*Міхаіл Гурын*

# БІТВЫ КАЛЯ МІРА Ў 1812 Г.

Мне непрыемна гаварыць або пісаць пра бітвы, таму што войны трагічна адбіліся на лёсе нашай Радзімы. Я трынаццаць гадоў шукаў магілу бацькі, якога ў 1944 г. забралі тут у Міры ад нас, немаўлят, і разам з сотнямі тысяч мірных мужчын загналі ў «мясарубку» пад Берлін. З вялікай крыўдай прыходзіцца даследаваць бітвы, што адбыліся паміж народамі, якія прысвоілі сабе імя Хрыста, але не засвоілі яго гуманныя запаветы. Так, на полі пад Грунвальдам нашы прадзеды-хрысціяне сумесна з палякамі, рускімі і мусульманамі-татарамі бязлітасна забівалі крыжакоў на іх жа тэрыторыі. Можна апраўдвацца, што гэта была справядлівая помста за шматлікія напады тэўтонцаў на наш край, але не варта пахваляцца такой «перамогай». Аднак, я заклікаю вывучаць забытыя бітвы XIII ст., што адбыліся на абшарах нашай Радзімы: каля Крутагор'я, Мазыра, Магільна, на «Шайбак-полі». Тады прадзеды баранілі краіну ад мангола-татараў, якіх заўсёды прыводзілі сюды рускія і украінскія князі. Дзякуючы мужнасці нашых продкаў, іх здольнасці даць належны адпор агрэсарам, Бацькаўшчына не спазнала мангольскага прыгнёту і нават не плаціла даніну чужынцам. У XV і пачатку XVI ст. вялікіх чалавечых ахвяр вымагала змаганне з крымскімі «людаловамі», якія рабілі рэгулярныя рэйды на наш край. Часта яны беспакарана рабавалі нашы гарады і вёскі, хапалі і гналі на продаж у Кафу дзесяткі тысяч юнакоў і дзяўчат. У 1506 г. непадалёк ад Міра на рацэ Уша і пад Клецкам крымчакі атрымалі расплату за свае шматлікія зладзействы. У выніку перамогі не толькі былі адабраны нарабаваныя каштоўнасці, але, што найважней, у родныя хаты вяр-

нулася больш 40 тыс. палонных. Вельмі шкада, што не захаваліся магілы рыцараў, якія загінулі ў гэтых бітвах.

Прыходзіцца канстатаваць, што бітвы каля Міра ў 1812 г., на жаль, пакуль што яшчэ належным чынам не вывучаныя. Мінула 200 гадоў, а праўды аб іх мы так і не ведаем. А ведаць патрэбна, каб пазбавіцца ад хлусні псеўдагісторыкаў. Мне не зразумела, чаму гэтыя бітвы ў энцыклапедыях і шматлікай літаратуры сціпла названы тэрмінам «баі». Можа, маецца на ўвазе адносна невялікая колькасць забітых? Але і тысячы загубленых у росквіце жыццяў не дазваляюць рабіць такі падзел. Для параўнання прывяду наступныя прыклады. Сутычка на Няве ў 1240 г. увайшла ў падручнікі як «бітва», хоць страты шведаў не падлічаны (можа, іх і не было), а «святы» Аляксандр не далічыўся толькі дваццаці наўгародцаў. Апошняя бітва за Маскву ў рускай літаратуры выдзяляецца велізарнымі чалавечымі стратамі: каля аднаго мільёна савецкіх салдат і болей 400 тыс. немцаў [17, с. 97, 238]. Аднак, самі немцы гібель сваіх салдат пад Масквой прызнаюць у колькасці толькі двух тысяч чалавек. Відаць, ваенныя гісторыкі не ў ладах з матэматыкай і лічбы «малююць» так, каб дагадзіць свайму палітычнаму кіраўніцтву. Настаў час, хоць бы дзеля нацыянальнага гонару, правільна палічыць ахвяры Радзімы ў шматлікіх войнах, каб наша грамадства зразумела, што не існуе альтэрнатывы нейтралітэту. А калі ўжо спатрэбіцца мець саюзнікаў у будучых змаганнях за незалежнасць Бацькаўшчыны, то шукаць іх варта сярод тых народаў, якія ў мінулым дапамаглі абараніцца ад лютых заваёўнікаў.

Вядома, што пры падзелах Рэчы Паспалітай ў канцы XVIII ст. горад Мір адчайна супраціўляўся расійскай акупацыі. Сталіца ардынацыі Нясвіж была далучана да Расіі ў выніку другога падзелу. Новыя ўлады бесцырымонна ў 1796 г. перайменавалі яго аж на 124 гады ў «заштатны» горад. А Мір, дзякуючы мужнасці гараджан, выстаяў да 1795 г., але за непакорнасць атрымаў статус мястэчка. Трэба падкрэсліць, што руйнаванне нашага краю пачалося задоўга да яго інкарпарацыі. Яшчэ ў 1764 г. Кацярына II праслала сюды вялікае войска, якое пустошыла і рабавала нашы гарады і вёскі. Менавіта 1764 г. датуецца спусташэнне Эрэміторыума ў Альбе і ўзнікненне знакамітага Эрмітажа ў Санкт-Пецярбургу. Неабходна знайсці дакументальныя звесткі аб тым, колькі тады загінула нашых людзей. Пазней тут лютавалі ваякі А. В. Суворава [7, с. 19–20]. Яго прыхільнікі і сёння пахваляюцца бліскучай перамогай 12 ве-

расня 1771 г. каля Міра і Сталавічаў, за якую ён быў узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага. Нам жа бракуе жадання і часу, каб палічыць забітых абаронцаў, знайсці іх магілы, ушанаваць памяць патрыётаў, што паляглі ў баях за незалежнасць Радзімы. Падкрэслю, што адбылася гэтая драма за 24 гады да таго, як расіяне афіцыйна сталі тут гаспадарамі.

Сорамна прызнацца ў тым, што мы слаба ведаем аб бітве пад Мірам у вайне 1792 г. [22]. Дзякуючы публікацыям апошніх гадоў сталі вядомыя зверствы расіян, учыненыя пры задушэнні паўстання 1794 г. Пасля інтэнсіўнага артылерыйскага абстрэлу яны штурмам узялі Мірскі замак, знішчылі яго гарнізон, разрабавалі яго багацці [21, с. 15]. Забіваючы нашых прадзедаў на роднай зямлі, А. В. Сувораў загадваў эканоміць порах і кулі, і раіў бязлітасна штыкамі калоць абаронцаў нашай Бацькаўшчыны. За гэта ён атрымаў высокае званне фельдмаршала. А Мірскае графства і ўся наша гістарычная Літва страцілі сваю незалежнасць, еўрапейскую славу, спрадвечную назву. Фактычна мы да цяперашняга часу знаходзімся ў арбіце вялікадзяржаўных інтарэсаў усходняга суседа.

Становіцца зразумелым, чаму нашым свабодалюбівым продкам хацелася як мага хутчэй выгнаць захопнікаў і адрадзіць гістарычную Літву. Лепшыя людзі краіны (С. Нямцэвіч, Т. Ваўжэцкі, К. Князевіч) хоць і вымушаны былі служыць акупантам, але не скарыліся лёсу, а працавалі над праектамі аўтаноміі ВКЛ у складзе імперыі [6, с. 201–211; 10, с. 86–93]. Найбольш прагрэсіўныя дзеячы марылі аб поўнай незалежнасці Радзімы. Прадчуваючы магчымую экспансію Францыі на ўсходнія землі, некаторыя палітыкі, набліжаныя да расійскага імператара Аляксандра I, спрабавалі ўгаварыць яго, каб згадзіўся на аўтаномію ВКЛ хоць бы дзеля аб'яднання літоўцаў і палякаў пад рускімі харугвамі як «славянскага манарха» супраць Напалеона Банапарта. Асабліва настойліва пераконваў Аляксандра I ў неабходнасці аднаўлення ВКЛ сенатар Міхал Клеафас Агінскі. У запісцы ад 15 траўня 1811 г. ён прасіў захаваць за Радзімай яе гістарычнае імя – Літва. Чарговы ліст Аляксандру I М. К. Агінскі падаў 3 лістапада 1811 г. У падрыхтоўцы новага плана прымалі ўдзел таксама Ф. Друцкі-Любецкі, К. і Л. Пляттэры. Аднак, расійскі імператар даў зразумець, што ў яго няма ні жадання, ні часу займацца праблемамі адраджэння ВКЛ. Не пажадаў ён звяртаць аніякай увагі і на памятную запіску Агінскага ад 1 снежня 1811 г. Нават у ходзе прадстаўленай Агінскаму аўдыенцыі Аляксандр I ухіляўся ад

абмеркавання праблемы пра наданне аўтаноміі заходнім губерням. Расійскі імператар ашуканствам спрабаваў пераманіць на свой бок многіх дзеячаў Літвы і Польшчы. Так, князя Юзафа Панятоўскага ён спакушаў, каб той з польскай арміяй перайшоў ад Напалеона на бок Расіі. Аляксандр I нават абяцаў абвесціць яго каралём. Аднак той не клюнуў на гэты падман. Каб дызарыентаваць грамадства ілюзіяй, быццам нешта робіцца для аднаўлення незалежнасці ВКЛ, вялася распрацоўка праекта канстытуцыі. Планавалася таксама арганізацыя асобнага літоўскага войска, аднак, толькі ў складзе ўзброеных сіл Расійскай імперыі. Не дала пажаданых вынікаў місія А. Чартарыйскага, мэтай якой было ўсялякімі спосабамі перацягнуць палякаў на бок Расіі [24, s. 60].

Нашы патрыёты ўсё больш пачалі давяраць французскаму імператару і ўскладваць надзеі на яго дапамогу. Нават сяляне разлічвалі на адмену прыгоннага права. Постаць Напалеона здавалася месіянскай у справе адраджэння ВКЛ. Але нашы лідэры добра разумелі, што асноўны цяжар змагання трэба браць на сябе ў саюзе з палякамі. Так, Дамінік Радзівіл у сакавіку 1811 г. абавязаўся выдаткаваць на ўтрыманне войска 180 тыс. злотых, акрамя гэтага выдзеліў 36 тыс. злотых на падрыхтоўку кадраў для арміі, а для кавалерыі перадаваў 100 коней [14, с. 30]. Разам з Юзафам Панятоўскім і іншымі патрыётамі ў красавіку 1811 г. ён яшчэ раз ездзіў у Францыю, каб прасіць дапамогі ў барацьбе з Расіяй. Тадэвуш Касцюшка, аднак, папярэджваў, што Напалеон, таксама як і Аляксандр I, думае толькі аб уласных амбіцыях. Рыхтуючыся да вайны з Расіяй, Напалеон планаваў закончыць кампанію 1812 г. у Мінску, найдалей ў Смаленску. «Вялікая армія» стваралася з актыўнай дапамогай кааліцыі еўрапейскіх дзяржаў. У ёй, акрамя французаў, было шмат італьянцаў, баварцаў, вестфальцаў, прадстаўнікоў іншых народаў. Каб заручыцца надзейнай падтрымкай нашых магнатаў і шляхты, Напалеон зрабіў канкрэтныя захады адносна адраджэння Вялікага княства Літоўскага. Указам ад 1 ліпеня 1812 г. ён зацвердзіў склад Часовага ураду ВКЛ, вызначыў тэрыторыю, якая павінна была знаходзіцца пад яго юрысдыкцыяй. Ураду было даручана кіраванне фінансамі краю, арганізацыя судаводства і адукацыі, правядзенне шэрагу мерапрыемстваў, неабходных для адраджэння галоўных элементаў ранейшай дзяржаўнасці. Хоць некаторыя прынцыповыя пытанні аб канчатковым афармленні ВКЛ і былі адкладзены да заканчэння вайны, нашы патрыёты паверылі ў добрыя

намеры Напалеона і рашуча перайшлі на яго бок. Акрамя таго, загадам ад 17 ліпеня французскі імператар даручыў ваеннаму савету Часовага урада ВКЛ на чале з князем А. Сапегам арганізаваць пяць пяхотных і чатыры кавалерыйскія палкі і выдзяліў на гэтыя мэты 500 тыс. франкаў. Л. Пац, А. Сапега, Д. Радзівіл сфарміравалі шэраг вайсковых частак агульнай колькасцю больш за 24 тыс. чалавек. Асобныя прадстаўнікі шляхты таксама арганізавалі атрады за свой кошт. Напрыклад, І. Манюшка сфарміраваў 21-ы конна-егерскі полк, М. Абрамовіч – полк гусараў, Любаўскі – полк конных стральцоў, Р. Тызенгауз – конна-артылерыйскую роту. Тут трэба асобна адзначыць тых нашых простых мірных землякоў, якія добраахвотна, па закліку сэрца, ўступілі ў вышэйназваныя воінскія падраздзяленні і мужна змагаліся на баку французаў не толькі каля Міра, але і пад Смаленскам, Мажайскам, Воранавам, на Барадзінскім полі. Шмат іх, як і палякаў, палягло ў гэтых бітвах. Нашы патрыёты засталіся вернымі Напалеону не толькі тады, калі ён трыумфальна рухаўся на Маскву, але і пасля таго, як атрымаўшы паразу, вяртаўся назад у Францыю. Многія нашы вайсковыя падраздзяленні пацярпелі пры адступленні, асабліва значна – пры фарсіраванні ракі Бярэзіны каля Барысава. Астатнія атрады праз Польшчу і Германію дайшлі да Францыі, страціўшы забітымі і палоннымі большасць асабовага складу. Сярод загінуўшых на апошнім этапе вайны – князі Дамінік Радзівіл, Юзаф Панятоўскі і іншыя вядомыя дзеячы, аб якіх мы, на жаль, так рэдка ўспамінаем.

Вывучаючы ход бітваў каля Міра і Сімакова, якія лічацца першымі ў ваеннай кампаніі 1812 г., я звярнуў увагу, што французаў у літоўска-польскіх падраздзяленнях было мала. Магчыма, яны выконвалі толькі абавязкі ваенных інструктараў. На такую думку наводзіла таксама рэакцыя французскіх гісторыкаў, якіх я запрашаў прыняць удзел, каб увекавечыць памяць нашай сумеснай барацьбы і паставіць годныя помнікі воінам, што загінулі ў Міры і яго ваколіцах. Відаць, мае французскія калегі лепш за мяне ведалі, што Напалеон вёў сваю армію не праз Мір, а праз Вільню, праследуючы 1-ю рускую армію Барклая дэ Толі. Праз Мір жа адступала з-пад Ваўкавыска 2-я руская армія князя П. І. Баграціёна. Яе гнала дывізія генерала А. Ражнецкага, што ўваходзіла ў воінскія злучэнні, агульнае камандаванне якімі Напалеон даручыў свайму брату Жэрому Банапарту, каралю Вестфаліі. Сёння варта было б высветліць, чаму менавіта каля Міра рускія вырашылі ўчыніць бітву, чаму адступалі

не напрасткі на Мінск, а павярнулі на Слуцк праз Нясвіж. Некаторыя тлумачаць такое рашэнне тым, што Баграціён у Міры даведаўся аб заняцці маршалам Даву горада Валожына. Быццам гэта азначала, што дарога на Мінск ужо была адрэзана. А можа планавалася, каб не толькі «адпачыць» у Нясвіжы, але і прыхапіць як мага больш радзівілаўскіх багаццяў? Для гэтага неабходна было пазбавіцца ад праследавання праціўніка. П. І. Баграціён даў загад атаману М. І. Платаву, у корпус якога ўваходзілі тры данскія казацкія брыгады, прытармазіць імклівае наступленне шасці уланскіх палкоў А. Ражнецкага і затрымаць іх хоць бы на два дні каля Міра. На дапамогу данскім казакам былі накіраваны яшчэ тры конныя і два пяхотныя палкі пад камандаваннем генерала І. В. Васільчыкава.

Як бачна на схемах размяшчэння падраздзяленняў для бітвы, прыведзеных у кнізе І. І. Растунова, 9 ліпеня атаман М. І. Платаў вырашыў каля Міра выкарыстаць тактычны манеўр казацкай конніцы – «венцер». Каб не дапусціць абыхода з флангаў, ён паслаў брыгаду Куцейнікава ў Стоўбцы, а тры казацкія палкі – у Сноў і Паланечку. У Міры галоўнай ударнай сілай павінен быў стаць полк Сысоева. Тры палкі кавалерыстаў пад камандаваннем генерала К. Турно рухаліся з Навагрудка ў накірунку на Мір. З мэтай заманіць іх у пастку і знішчыць, Платаў размясціў абапал дарогі на Карэлічы, ў знаёмых мне з дзяцінства лясах каля вёскі Пясочна, дзьве сотні казакоў. Трэцяя сотня, быццам незнарок, рухалася з Міра ў бок Карэлічаў, аднак, заўважыўшы непрыяцеля, павярнула назад у Мір. Уланы генерала К. Турно кінуліся за гэтай групоўкай, але былі контратакаваныя і з горада, і з засады. Яны вымушаны былі адступаць аж да Турца. Бой быў вельмі жорсткі. У ім удзельнічала каля чатырох тысяч рускіх і звыш двух тысяч нашых вайскоўцаў [16, с. 194]. Страты рускіх склалі ўсяго 25 чал. забітымі і параненымі [5, с. 72]. Польска-літоўскае войска каля Міра страціла забітымі восем афіцэраў і 348 шараговых [19, с. 142]. 248 чал., у тым ліку два палкавыя камандзіры, трапілі ў палон. Раніцой 10 ліпеня ўся дывізія А. Ражнецкага падыйшла да вёскі Сімакова, пачала баявыя дзеянні супраць часцей Васільчыкава і значна пацясніла іх. Аднак, са своечасовым падыходам з-пад Стоўбцаў брыгады Д. Е. Куцейнікава, якую на месца бітвы прывёў жыхар Сімакова, Дзяніс, нашы абаронцы былі адціснуты да Міра. Але іх адступленне хутка прыпынілася, таму што на падмогу паспела конная брыгада генерала Т. Тышкевіча з артылерыйскім падраздзяленнем. У ходзе бітвы больш за 600 чал. было забіта і

некалькі сотняў трапіла ў палон. Гэта дало повад рускай прапагандзе сцвярджаць аб перамозе. Але корпус атамана Платава спешна адыйшоў да Нясвіжа і злучыўся з галоўнымі сіламі 2-й рускай арміі, якая вымушана была прадоўжыць адступленне. За Нясвіжам, каля мястэчка Раманава, рускія далі яшчэ адзін бой, каб стрымаць наступальны парыў нашых уланаў.

М. І. Платаў у рапарце П.І. Баграціёну паведамляў аб вялікіх стратах свайго казацкага корпуса ў бітвах каля Міра і Сімакова [11, с. 236]. Агульная колькасць забітых з абодвух бакоў у дакументах прыведзена прыблізна: «на месте битвы осталось 1000 чел. и 500 скотских трупов» [2, с. 356]. Аднак Баграціён падбадзёрыў салдатаў і даў высокую ацэнку дзеянням усёй 2-й рускай арміі. У лісце да мінскага губернатара Добрынскага ён прасіў інфармаваць насельніцтва губерні аб "слаўнай" перамозе каля мястэчка Мір. Але ці меў права палкаводзец так гаварыць, калі яго армія па-ранейшаму адступала? За бітвы каля Міра і Сімакова 14 расійскіх жаўнераў былі ўзнагароджаны ордэнамі. Пазней гэтыя бітвы, як пераможныя, шматразова згадваліся ў рускай гістарычнай і мастацкай літаратуры. Н. П. Красоўскі прысвяціў ім палатно «Дело казаков Платова под Миром», якое заняло належнае месца ў Барадзінскай панараме.

Трэба адзначыць, што на працягу ўсёй ваеннай кампаніі 1812 г. Мірскі замак быў апорным пунктам кавалерыі генерала Дамброўскага [12]. Паблізу адбыліся баі з тылавымі расійскімі ваеннымі падраздзяленнямі. Далёка ад мора ствараў сабе «імідж» адмірал П. В. Чычагоў. Вядома, што 7 лістапада ён змагаўся каля Міра, Новасвержня і Нясвіжа з прысланымі для падмацавання войскамі, якія накіраваў сюды мінскі губернатар М. Бранікоўскі. Асаблівы супраціў адміралу Чычагову аказаў 17-ы полк літоўскай кавалерыі, сфарміраваны ў Навагрудку. Яго камандзірам быў граф М. Тышкевіч. Гэты полк, разам з іншымі злучэннямі, быў пад агульным камандаваннем брыгаднага генерала Ф.Касецкага. Супраць яго Чычагоў выслаў авангард генерала К. Ламберта, а атрад палкоўніка К. Кнорынга накіраваў у Нясвіж, які ім быў захоплены 11 лістапада. У ходзе боя 2-гі эскадрон 17-га палка літоўскай кавалерыі страціў 70 чал. забітымі і параненымі. 12 лістапада працягваліся баі каля Міра, Нясвіжа і Новасвержня, дзе пацярпелі паражэнне асноўныя сілы генерала Ф. Касецкага. 14-ты егерскі полк А. Красоўскага ў Новасвержні акружыў з усіх бакоў нашых жаўнераў і прымусіў іх здацца. Генерал Ф. Касецкі прыслаў батальён у Мір, каб выгнаць з горада казакоў. Ад-

нак, высветлілася, што казакі яшчэ раніцай выбілі з Міра палякаў і літвінаў і ўзялі ў палон 400 чал. У гэты дзень нашы страты складалі каля 500 чал. забітымі. 13 афіцэраў і 760 воінаў трапілі ў палон. На наступны дзень 14 лістапада данскія казакі разбілі каля Міра нашы войскі і ўзялі ў палон 200 чал. пяхоты і 100 кавалерыстаў [1, с. 87-89]. Адмірал Чычагоў нарабаваў так шмат багаццяў, што шчодра падзяліўся з іншымі «сябрамі». Так, Харкаўскаму універсітэту ён падарыў дзве вялікія скрыні манетаў і медалёў. Рабаўніцтвам вызначыўся і палкоўнік К. Б. Кнорынг. Генерала С. А. Тучкова, які неахвотна дзяліўся трафеямі, расійская феміда пасля пераможнай вайны больш дванаццаці гадоў цягала па судах за прысваенне ваеннай здабычы, але нарэшце апраўдала [18, т. 14, с. 602].

Наша нешчаслівае змаганне за незалежнасць Радзімы прывяло да спусташэння роднага края. Вытаптаныя конніцай пасевы, спаленыя вёскі і гарады, рэквізіцыі прадуктаў харчавання і фуражу для войскаў. Усяго не пералічыць. Акрамя вялізарных матэрыяльных каштоўнасцяў, наша Радзіма ў «маланкавай» вайне 1812 г. не далічылася каля мільёна сваіх сыноў і дачок. Ашаламляльна велізарныя страты мы панеслі, хутчэй за ўсё таму, што вайна мела для нас братазабойчы характар. Так, для рускіх яна была «айчыннай», але наша гістарыяграфія павінна называць яе грамадзянскай вайной. Гэты тэрмін становіцца больш зразумелым па-польску: «wojna domowa». Не толькі ў бітвах каля Міра, але і на працягу ўсёй кампаніі 1812 г. нашы продкі, умоўна падзяліўшыся на два лагеры, бязлітасна знішчалі як іншаземцаў, так і суайчыннікаў.

Пасля разгрому Францыі геапалітычная сітуацыя ў Еўропе склалася пераважна на карысць Расіі. Прадастаўленне ёю аўтаноміі Каралеўству Польскаму выклікала сярод нашых патрыётаў надзею на магчымае далучэнне да яго і нашых зямель, хоць Аляксандр I, як раней Напалеон [20, с. 53], і не збіраўся павялічваць польскую тэрыторыю за кошт нашых земляў. Спадзяванні ўмацаваліся пасля стварэння асобнага Літоўскага корпуса, штандарам якога быў зацверджаны наш старажытны сімвал "Пагоня" [23, s. 14]. Аднак лібералізм Аляксандра I хутка згас, асабліва калі на яго рашуча накінуліся расійскія крумкачы, якія заявілі: «Адраджэнне Польшчы будзе распадам Расіі; Літва, Валынь, Падолія жадаюць каралеўства Польскага, а мы жадаем адзінай імперыі Расійскай».

Ужо амаль на працягу семідзесяці гадоў я перыядычна наведваю мясціны, звязаныя з бітвамі 1812 г. каля Міра і Сімакова,

Нясвіжа і Новасвержня. Хаджу па палях, залітых крывёю абаронцаў нашай Радзімы. Прызнаюся, што сам мала пастараўся, каб даследаваць падзеі тых дзён на роднай зямлі. Несуменна, важныя матэрыялы дало б археалагічнае абследаванне мясцовасці з дапамогай сучасных прыладаў. Напрыклад, разнастайныя артэфакты часоў вайны 1812 г. былі здабыты землечарпалкаю з дна ракі Бярэзіны каля вёскі Студзёнка яшчэ ў 1896 г. [2, с. 368-369]. Асабліва балюча, што не былі пазначаны належным чынам масавыя пахаванні. Па гэтай прычыне мы не можам сёння наведаць іх, аддаць даніну памяці і пакласці кветкі на дарагія магілы. У бліжэйшы час неабходна правесці даследаванні, каб выявіць магілы герояў вайны 1812 г., устанавіць на іх помнікі, уключыць іх ў турыстычныя маршруты.

Я некалькі разоў пабываў на могілках каля г. Баўцэн, дзе ў 1813 г. было пахавана сэрца фельдмаршала М. І. Кутузава. Увогуле, я прыклаў шмат намаганняў, каб арганізаваць пошук магіл нашых людзей, якія, адступаючы разам з Напалеонам, паляглі ў бітвах пад Дрэздэнам, Ляйпцыгам, Лютцэнам, Райхэнбахам.

У бітве пад Ганаў быў смяротна паранены князь Дамінік Геранім Радзівіл. На левым беразе Рэйна, у маляўнічай мясцовасці паблізу Лаўтрэкена, ва ўзросце 27 гадоў 11 лістапада 1813 г. закончылася жыццё законнага гаспадара Мірскага графства. Яго цела было прывезена ў Варшаўскі касцёл капуцынаў, а сэрца змешчана ў касцёле ў Красным. Набліжаецца 200-годдзе з дня яго гібелі, але парэшткі мужнага князя так і не перавезены ў крыпту Нясвіжскага касцёла, дзе спачываюць многія яго родныя. Можа, варта нам заняцца гэтай высакароднай справай?

### Літаратура і крыніцы

1. Бектинеев Ш.И. Несвижско-койдановские бои (октябрь – ноябрь 1812 года) // Мастацкая спадчына Нясвіжа. Нясвіж, 2006. С. 84–94.
2. Беларусь и война 1812 года: Документы / Сост. А. М. Лукашевич, Д. Л. Яцкевич. Минск, 2011.
3. Богданович М. История Отечественной войны 1812 г. по достоверным источникам. Т. 1. СПб., 1859. С. 159–163.
4. Бутурлин Д. П. История нашествия императора Наполеона на Россию в 1812 г.: Пер. с франц. Ч. 1. СПб., 1823.
5. Гарин Ф. А. Изгнание Наполеона. М., 1948.
6. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. Кн. 1. Мінск, 2011.

7. Гурин М. Ф. Мир: Историко-экономический очерк. Минск, 1985.
8. Гурын М. Ф. Дамінік Радзівіл і лёс Нясвіжа // Музы Нясвіжа. Мінск, 2001.
9. Донские казаки в 1812 г.: Сборник документов. Ростов н/Д, 1954. С. 89-105.
10. Ерашэвіч А. Палітычныя праекты адраджэння Рэчы Паспалітай і Вялікага княства Літоўскага ў палітыцы расейскага царызму напярэдадні вайны 1812 г. // Гістарычны альманах Т. 6. Гародня, 2002.
11. Иностранцев М. Отечественная война 1812 года: Операция 2-й Западной армии. СПб., 1914.
12. Иодковский И.И. Замок в Мире // Древности. Т. VI. М., 1915.
13. Мирный В. А. Отступление армий в 1812 году д Дриссы и Несвижа: Кавалерийские бои под Миром. М., 1912.
14. Папко В. Нясвіжская ардынацыя князёў Радзівілаў у XIX стагоддзі // Беларускі гістарычны часопіс. 2006. № 1. С. 30–36.
15. Праект указа аб новай арганізацыі заходніх губерняў // Адраджэнне. Гістарычны альманах. Мінск, 1995.
16. Ростунов И. И. Петр Иванович Багратион. М., 1957.
17. 77 самых известных сражений. М., 2009.
18. Советская историческая энциклопедия. Т. 14. М., 1973.
19. Харкевич В. 1812 год в дневниках, записках и воспоминаниях современников. Вып. 1. Вильна, 1900.
20. Швед В. В., Данскіх С. У. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. Гродна, 2006.
21. Шишигина-Потоцкая К. Я. Замки Мирский и Несвижский. Барановичи, 2001.
22. Górski R. Wojna 1792 roku. Kraków, 1917.
23. Mościcki H. Projekty połączenia Litwy z Królestwem Polskim. 1813–1830. Warszawa, 1928.
24. Nawrot D. Litwa i Napoleon w 1812 roku. Katowice, 2008.